# ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА ПРАРЭКТАРА ПА НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ ПРАФЕСАРА А. М. ГАРЛАТАВА

Шаноўныя ўдзельнікі і госці канферэнцыі! Паважаныя калегі!

Я маю высокі гонар ад імя старшыні аргкамітэта – рэктара ўніверсітэта Н. П. Баранавай – сардэчна вітаць вас на адкрыцці чарговай сустрэчы і пры гэтым адзначыць наступнае.

Ваша сустрэча сабрала ў гэтай зале прадстаўнікоў Беларусі, Германіі, Польшчы і Расіі, што сведчыць аб захаванні сталага інтарэсу навукоўцаў розных краін да беларуска-германскай гістарычнай праблематыкі.

Праграма канферэнцыі і тэматыка выступленняў яе ўдзельнікаў пераконвае, што новыя рэаліі сучаснага развіцця не толькі ставяць перад даследчыкамі актуальныя праблемы і задачы, але і патрабуюць сумеснага пошуку адэкватных шляхоў па іх паспяховым вырашэнні.

Адной з такіх задач з'яўляецца працяг сустрэч прадстаўнікоў розных навуковых школ з мэтай больш поўнага, ўсебаковага і параўнаўчага абмеркавання супярэчлівых пытанняў мінулага і сучаснасці.

Знакавым у правядзенні канферэнцыі бачыцца і тое, што яна прысвячаецца 75-годдзю абарончых баёў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 года. Тры чвэрці стагоддзя мінае з тых часоў, аднак навуковы інтарэс да ваеннай гісторыі застаецца, не знікае ён і ў беларускім грамадстве. У Беларусі шмат напісана аб тым перыядзе. Не спыняецца гэта справа і сёння – такая заканамернасць гісторыі як навукі. Чым далей адсоўваюцца ад нас тыя падзеі, тым больш раскрываюцца іх таямніцы і тым грунтоўней павінен праводзіцца іх аналіз з выкарыстаннем новых дакументальных крыніц. У значнай ступені гэта адбываецца дзякуючы вашаму асабістаму ўдзелу і прафесійнай працы па стварэнні сучаснай навуковай базы гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Правядзенне 15-й Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў МДЛУ мы разглядаем як прызнанне пэўных поспехаў гісторыкаў нашага ўніверсітэта. За час пасля мінулагодняй сустрэчы імі выдадзены 2 манаграфіі, у тым ліку: Новікаў С. Я. «Беларусь улетку 1941 год: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў» (2-е выд., Смаленск: Універсум, 2015. – 436 с.), Цымбал А. Г. «Праваслаўная царква ў Заходняй Беларусі (1921–1939)» (Мінск: МДЛУ, 2016. – 124 с.), а таксама матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», вып. 14 (Мінск: МДЛУ, 2016. – 304 с.).

Нагадаю, што канферэнцыя праводзіцца ў адпаведнасці з планам выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава» (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя).

Упэўнены, што новыя думкі і высновы, да якіх вы прыйдзеце ў выніку абмеркавання пастаўленых праблемных пытанняў, не застануцца толькі ў сферы акадэмічнай навукі, але паўплываюць на вырашэнне актуальных інфармацыйных задач у нашым грамадстве, асабліва ў справе выхавання і прафесійнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі. У нашым універсітэце студэнты актыўна ўдзельнічаюць у даследчыцкай рабоце, творча падыходзяць не толькі да правядзення студэнцкай навуковай работы па гістарычнай праблематыцы, але і практычнага выкарыстання гісторыка-дакументальных напрацовак пры выкананні курсавых і дыпломных праектаў па напрамку спецыяльнасці «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (міжнародны турызм)».

Шаноўныя калегі, госці і сябры МДЛУ! Дазвольце аб'явіць адкрытай 15-ю Міжнародную навуковую канферэнцыю «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць» і пажадаць удзельнікам поспехаў у такой важнай сферы навуковай дзейнасці, якая дапамагае вывучаць, развіваць і памятаць ваеннае мінулае.